# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2023 года*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

## 11 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.**

| Слова | Прапушчаныя літары | Слова | Прапушчаныя літары |
|---|---|---|---|
| *авіякампанія “Белав_ _”* | **ія** | *рад_ _лагічны заказнік* | **ые** |
| *пал_ _нталогія* | **еа** | *Більб_ _* | **аа** |
| *г_ _цынт* | **ія** | *_ _нічнае мора* | **іа** |
| *_ _рархічны* | **іе** | *мас-мед_ _* | **ыя** |
| *рад_ _канал* | **ыё** | *стэр_ _тыпны* | **эа** |
| *імпрэсар_ _* | **ыа** | *аўд_ _запіс* | **ыя** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 2.**

| Словы | Магчымая фармулёўка значэння |
|---|---|
| павекі | Рухомыя складкі скуры, якія прыкрываюць вочы |
| сцягно | Частка нагі жывёлы або чалавека ад таза да калена |
| зрэнка | Кропка ў радужнай абалонцы, праз якую пранікае святло ўнутр вока |
| цягліцы | Тканкі жывога арганізма, здольныя скарачацца і забяспечваць функцыю руху частак цела |
| сківаца | Костка твару, у якой умацаваны зубы |
| патыліца | Задняя частка галавы |

*За кожнае прынцыпова правільную фармулёўку лексічнага значэння – 0,5 бала, за правільна прыведзены прыклад, які ілюструе гэтае значэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 3.**

| Зыходная форма | Суфікс | Вытворная форма |
|---|---|---|
| *белы* | ***-еньк-*** | ***беленькі*** |
| *белы* | ***-ават-*** | ***белаваты*** |
| *белы* | ***-ютк-*** | ***бялюткі*** |
| *белы* | ***-юсеньк-*** | ***бялюсенькі*** |
| *белы* | ***-яв-*** | ***бялявы*** |
| *белы* | ***-ёс- (-ес-)*** | ***бялёсы (бялесы)*** |

*За кожную пару (падабраны суфікс і вытворную форму) – 1 бал.*

**Заданне 4.**

А3 Б2 В3 Г3 Д1 Е3

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.**

| № | Сцверджанне | +/– |
|---|---|---|
| **1** | Стыль тэксту: | |
| | гутарковы | – |
| | публіцыстычны | + |
| | навукова-папулярны | – |
| **2** | У слове ***Мікалаеўшчына*** | |
| | 13 літар 13 гукаў | – |
| | 13 літар 12 гукаў | – |
| | 13 літар 14 гукаў | + |
| **3** | У слове ***з’езд(а,у)*** | |
| | правапіс канчатка залежыць ад значэння слова | + |
| | пішацца толькі канчатак ***-у*** | – |
| | пішацца толькі канчатак ***-а*** | – |
| **4** | Сінонімамі да слова ***нелегальны*** | |
| | пішацца асобна | – |
| | пішацца разам | + |
| | пішацца праз дэфіс | – |
| **5** | У слове ***Санкт-Пецярбур(гу,ге,зе)*** | |
| | пішацца ***гу*** | + |
| | пішацца ***зе*** | – |
| | пішацца ***ге*** | – |
| **6** | Слова ***нелегальны*** мае значэнне: | |
| | Несвабодны, закрыты, з абмежаваным уваходам | – |
| | Не дазволены законам, падпольны | + |
| | Хуткі, з кароткім тэрмінам дзеяння | – |

*За кожны правільны адказ (станоўчы) – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| Групы | Нумар трэцяга лішняга сказа | Тлумачэнне |
|---|---|---|
| ***I*** | 3 | У 1 і 2 сказах даданыя часткі звязаны з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў *калі* і *бо*, а ў 3 сказе – пры дапамозе злучальнага слова *як*. |
| ***II*** | 2 | У 1 і 3 сказах злучальнае слова выконвае сінтаксічную функцыю азначэння, а ў 2 сказе – дапаўнення. |
| ***III*** | 3 | У 1 і 2 сказах даданая акалічнасная ўмовы, а ў 3 – даданая азначальная. |

*За кожны правільны радок – 2 балы (1 бал за ўказанне нумара трэцяга лішняга сказа і 1 бал за тлумачэнне).*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Сёння давялося ў адзіноце разбіраць Скрабіна. Гукі, як ледзяныя шарыкі, павольна падаюць у грудзі, у глыб цёмнага возера без дна. Упаўшы, калышуць вільгаць і тонуць *(патанаюць)*, а вільгаць прыліпае і адыходзіць, і там, у гарачай цемры, гулка, трывожна стукае *(ўдарае)* сэрца, нібы зараз, у гэта імгненне, павінна адбыцца штосьці *(нешта)* немагчымае. Даша апусціла рукі на калені і ўзняла *(падняла)* галаву. У мяккім святле аранжавага абажура глядзелі са сцен барвовыя *(барвяныя)*, успухлыя *(распухлыя)*, ашчэраныя *(выскаленыя, вышчараныя)*, з вытарашчанымі *(вытрашчанымі, вылупленымі)* вачыма твары, нібы *(быццам)* прывіды першароднага хаосу, якія прагна абляпілі ў першы дзень тварэння агароджу райскага саду.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| Тэрмін | Прыкладнае азначэнне |
|---|---|
| **Гіпербала** | Моцнае перавелічэнне ўласцівасцей, якасцей ці памераў прадмета або з'явы з мэтай узмацнення выразнасці |
| **Партрэт** | Апісанне знешнасці персанажа, якое характарызуе яго як чалавека. |
| **Проза** | Слоўна-мастацкая творчасць, заснаваная на празаічнай мове. |
| **Эпас** | Род літаратуры, у якім выкарыстоўваецца апавядальны спосаб паказу жыцця ў яго сюжэтным развіцці. Вызначаецца шырынёй ахопу падзей, характараў, абставін, малюнкаў прыроды. |

*За кожны правільна вызначаны тэрмін – 0,5 бала, за кожнае прынцыпова правільнае (якое перадае сэнс паняцця) азначэнне – 1 бал. Калі тэрмін ўнесены няправільна (нават пры правільным яго азначэнні), то аднімаецца 0,5 бала. Агульная колькасць балаў за заданне – не менш за нуль.*

**Заданне 9.**










| | | |
|---|---|---|
| *Гэта манета прысвечана юбілею* **Максіма Танка (Яўгена Іванавіча Скурко)** | *Гэта манета прысвечана юбілею* **Вінцэнта Іванавіча Дуніна-Марцінкевіча** | |
| *Праўдзівыя факты:* **2, 7, 8, 9** | *Праўдзівыя факты:* **3, 5, 6** | *Іншыя факты:* **1, 4, 10** |

*За правільнае вызначэнне пісьменнікаў – па 0,5 бала. За кожнае правільнае суаднясенне факта – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Заданне можа быць ацэнена па трох крытэрыях: колькасць выкарыстаных слоў і словазлучэнняў (далей – словы), адпаведнасць прапанаванага тэксту дадзеным тлумачэнням, наяўнасць фактычных памылак.*

| *Колькасць выкарыстаных слоў* | |
|---|---|
| *Колькасць балаў* | *Крытэрыі* |
| *2* | *Выкарыстаны ўсе прапанаваныя словы* |
| *1* | *Выкарыстана не менш за 5 слоў* |
| *0* | *Выкарыстана менш за 5 слоў* |

| *Адпаведнасць прапанаванага тэксту дадзеным тлумачэнням* | |
|---|---|
| *Колькасць балаў* | *Крытэрыі* |
| *2* | *Прапанаваны тэкст поўнасцю адпавядае адрасату, вытрыманы навуковы (навукова-папулярны) стыль выкладу* |
| *1* | *Прапанаваны тэкст толькі часткова адпавядае заяўленаму адрасату, маюцца нязначныя парушэнні стылёвага характару* |
| *0* | *Прапанаваны тэкст поўнасцю не адпавядае заяўленаму адрасату, тэкст не адпавядае навуковаму (навукова-папулярнаму) стылю* |

| *Наяўнасць фактычных памылак* | |
|---|---|
| *Колькасць балаў* | *Крытэрыі* |
| *2* | *Фактычныя памылкі адсутнічаюць* |
| *1* | *У тэксце маецца не больш за 2 фактычныя памылкі* |
| *0* | *У тэксце маецца больш за 2 фактычныя памылкі* |